Алег Віктаравіч Дзячэнка

3 Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Алег Віктаравіч Дзячэнка (нар. 14 чэрвеня 1971, Канск, Краснаярскі край, Расія) — беларускі філосаф, рэлігіязнавец, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання. Кандыдат філасофскіх навук (2000), дацэнт (2004).

Алег Віктаравіч Дзячэнка

Дата нараджэння	14 чэрвеня 1971 (52 гады)
Месца нараджэння	Канск, Краснаярскі край, РСФСР, СССР
Грамадзянства	Беларусь
Род дзейнасці	выкладчык універсітэта
Месца працы	АПА
Навуковая ступень	кандыдат філасофскіх навук
Альма-матар	МДУ імя А. А. Куляшова
Узнагароды	Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2005)

Біяграфія

Скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. А. Куляшова (1995), Інстытут філасофіі і права НАН Беларусі (аспірантура, 2000).

З 2001 па 2014 гады працаваў дацэнтам кафедры філасофіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. З 2014 па 2017 гады працаваў прарэктарам па навукова-метадычнай працы ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны абласны інстытут развіцця адукацыі». З 27 студзеня 2017 года па 6 кастрычніка 2017 года займаў пасаду загадчыка кафедры грамадзянскага і гаспадарчага права факультэта эканомікі і права Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. З 25 кастрычніка 2017 года па 16 мая 2022 года працаваў прарэктарам па навучальнай працы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. З 17 мая 2022 года займае пасаду рэктара дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»[1].

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання[2].

Узнагароды

Граматы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2005), Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта (2000), Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта (2004, 2013) і інш.

Заўвагі

1. Дьяченко Олег Викторович (https://akademy.by/index.php/ru/about-us/personalii/185-dyachenko-oleg-viktorovich)

2. Дьяченко Олег Викторович (http://www.sovrep.gov.by/ru/senators-ru/view/djjachenko-oleg-636/)

Літаратура

- Движение пятидесятников в Беларуси (на материалах Могилевской области) : диссертация … кандидата философских наук : 09.00.06 : защищена 26.09.2000 : утверждена 13.12.2000 / Дьяченко Олег Викторович. — Минск, 2000.
- Новые религиозные объединения / О. В. Дьяченко. — Мозырь, 1998.
- Пятидесятничество в Беларуси : монография / О. В. Дьяченко. — Могилев, 2003.
- Алег Віктаравіч Дзьячэнка [Дзячэнка!] // Гістарычны факультэт : да 75-годдзя ўтварэння / Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова. — Магілёў, 2010. — С. 178—179.
- Дьяченко Олег Викторович // Ученые МГУ имени А. А. Кулешова : биобиблиографический справочник. — Могилев, 2013. — С. 18—20.

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Алег_Віктаравіч_Дзячэнка&oldid=4520122"

Пераключыць абмежаваную шырыню зместу